# ПОЛЫМЯ

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ
І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ ЧАСОПІС

9 (1139)

ВЕРАСЕНЬ 2024

Выдаецца
са снежня 1922 года

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь;
Грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі»;
Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Мастацкая літаратура»

Намеснік дырэктара — галоўны рэдактар
Віктар Анатольевіч ШНІП

Рэдакцыйная калегія:

Лада АЛЕЙНІК, Уладзімір АНДРЫЕВІЧ,
Алесь БАДАК, Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ,
Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ,
Уладзімір ГУСАКОЎ, Марыя ЗАХАРЭВІЧ,
Віктар ІЎЧАНКАЎ, Аляксандр КАВАЛЕНЯ,
Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, Валерый МАКСІМОВІЧ,
Зоя МЕЛЬНІКАВА, Пётр НІКІЦЕНКА,
Віктар ПРАЎДЗІН, Зіновій ПРЫГОДЗІЧ,
Іван САВЕРЧАНКА (старшыня),
Уладзімір САЛАМАХА, Васіль СТАРЫЧОНАК,
Таццяна ШАМЯКІНА, Наталля ЯКАВЕНКА

Мінск
УП «Мастацкая літаратура»
2024

ПАЭЗІЯ

# Віктар Гардзей

# МІЛЕЙ ШЫРАТА, ШТО З ДЗЯЦІНСТВА ТВАЯ...

*Вершы*



***Гардзей Віктар Канстанцінавіч*** нарадзіўся 19 жніўня 1946 года ў вёсцы Малыя Круговічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1984). Працаваў у часопісах «Беларусь», «Родная прырода», «Маладосць», «Полымя», «Вожык», у выдавецтве «Мастацкая літаратура», газеце «Літаратура і мастацтва».

Аўтар зборнікаў паэзіі «Касавіца» (1975), «Верасное палясоўе» (1978), «Засевак Радзімы» (1983), «Незабудкі азёр» (1985), «Узрушэнне» (1988), «Дзікая пчала» (1994), «Зялёныя дажджы» (1997), «Межань» (1999), «Трыадзінства» (2010), кніг прозы «Дом з блакітнымі аканіцамі» (1984), «Карані вечнага дрэва» (1988), «Уратуй ад нячыстага» (1992), трылогіі «Аселіца ў басейне Чорнага мора» (2000), рамана «Бедна басота» (2003), кнігі выбраных твораў прозы «З мінулага не вяртаюцца» (2014), шматлікіх паэтычных кніжак для дзяцей.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа (1994), Літаратурнай прэміі «Залаты Купідон» (2008) і іншых.

## ДАДОМУ

Пара ўжо збірацца дадому,
Не вечна гуляць у гасцях.
Няма злітавання нікому,
І смуткам усцелены шлях.

Выходзіць з дубровы і гаю,
І бору паклон, як заўжды.
Забыў ці яшчэ забываю
Свае маладыя гады.

Гара тут з бярозкай павіслай
Запала мне ў вочы даўно.
Віно не збрадзіла, а скісла —
Не п’ецца сухое віно.

Ні рому, ні грогу, ні элю:
Знаёмы не сніцца пірат.
Пабачыць бы Зіну і Гэлю,
Але і ўспамінаў няшмат.

Дадому пара, чалавеча,
А як абмінуць растанцы?
Дадому! І кропка! — Бы веча
Гукнула свайго на пляцы.

## ВАНДРОЎНІК

За ноч лясы памаладзелі.
— Стаміўся, ідучы? — Яшчэ б!
На небе залежы кудзелі,
А ў нас тут сціплы шырпатрэб.

На небе воблак белых пража,
Разліты сіні анілін.
Адзін ідзеш, а хто падкажа:
Сядзь адпачынь, калі адзін.

Заблудны гром, гусцей паўторквай
Струмені вострыя дажджу!
Ільном запахне, бульбай, морквай,
Дзе я хадзіў або хаджу.

Якія ж у сядзельца зборы?
Падняўся, глянуў і пайшоў.
Крыжы — мінулых дзён узоры
Сярод каменняў-галышоў.

Ён застаецца, край палескі,
У тым, чым славіўся, жыве.
Вандруй — пабачыш арабескі,
Што ўроссып ззяюць на траве.

## СВАЯ ШЫРАТА

Якія, да д’ябла, цяпер летуценні?
Жылося не вельмі і ў смутку прайшло.
Забыта не ўсё, што лягло на сумленні,
Не трэба і тое, чаго не было.

Па сцежках блукалі дзе гразкіх, дзе тупкіх,
А блізкае бачыцца лепей здалёк.



ПРОЗА

**Уладзімір Гніламедаў**

# У ВОЙСКУ

*Раман. Першая частка. Заканчэнне.*
*Пачатак у № 7, 8 за 2024 г.*

## VIII

Дзяжурства па кухні Платонаў прыняў яшчэ звечара ад свайго папярэдніка Неўмывакіна, які ў дыскусіі, што адбылася ў сталовай, хваліў селядцы «івасі».

— Мяне часта ў нарад сюды пасылаюць, — не то крыўдзіўся, не то хваліўся ён. — Я, братка, тут кожную місачку ведаю, кожную кружку з усімі яе ўмяцінамі. Усё мыў, праціраў, вось і сёння перадаю табе чыстае. Гэта прозвішча ў мяне такое — Неўмывакін, а чысціню мы паважаем.

Неўмывакін трэці год у арміі, чакае дэмабілізацыі, «дэмбеля». Ужо хутка.

Назаўтра Платонаў устаў яшчэ да агульнай каманды «Рота, пад'ём!». Без каманды пачысціў зубы, памыўся, заправіў пасцель. Апрануўся і зірнуў у акно. Займалася на дзень. Пры месяцовым святле зямля і ўсё, што на ёй знаходзілася, набылі матавае адценне і яшчэ хаваліся ў імгле. Ледзь прыкметным бляскам ззялі праталіны. Недзе за дротам гучна завыў сабака, нібы ўспомніўшы нешта непрыемнае. Платонаў уздыхнуў, прыгадаў вычытаную недзе сентэнцыю: «Некаторыя лічаць, што поспех прыходзіць да тых, хто рана ўстае. Не, поспех прыходзіць да тых, хто ўстае ў добрым настроі». Народная мудрасць!

Не марудзячы, падаўся на кухню. Наліў у катлы (іх было два) вады. Гэта нескладана — вада з артэзіянскай свідравіны. Адзін кацёл на якую-небудзь страву, другі — на чай і іншыя патрэбы. Побач на пліце бляха, на якой Дзадзанія смажыў катлеты. Стаў распальваць печ, але сырыя дровы не надта разгараліся. Урэшце пайшло ўсё ж такі на лад, калі паклаў болей сухіх трэсак. У печы зашумела і загуло.

З'явіўся заспаны Дзадзанія з кіслай фізіяноміяй.

— Здароў!

— Здароў!

— Першы раз? — спытаў «грузінскі князь», адчуўшы, што яго памочнік крыху хвалюецца.

— Першы.

Дзадзанія закурыў і, не вымаючы цыгаркі з рота, апрануў свой кухарскі халат і нацягнуў на галаву белы каўпак.

— Сёння прыгожае неба, — заўважыў ён, смакуючы цыгарэту, — тархуннага колеру.

— Якога?

— Тархуннага. Тархун — расліна, у Грузіі расце, зялёнага колеру. Вось неба такое, будзе добрае надвор'е. Грузінская прыкмета. У нас шмат дакладных прыкметаў. Табе не халадно?

— Не.

— Зараз сагрэешся. Сёння ў нас на снеданне па плане што? Ячная каша з маргарынам і гарачы чай. Так, на абед суп з турнэпсу, катлеты з грэчкай, на вячэру рыба з бульбяным пюрэ. Усё ясна. — Повар скрывіў вусны, на твары ў яго было напісана, што ўсё гэта яму парадкам надакучыла.

Прыйшоў Тула, выдаў са склада прадукты. Расшчодрыўся, дадаў яшчэ салёных агуркоў. Чутно ўжо, як хляхоча, бунтуецца ў катлах вада, кіпіць.

— Грэй, каб кіпень у нас быў круты! — загадаў кухар, высыпаючы ячныя крупы ў адзін з катлоў. — Хлеб наразай!

— Да кашы — хлеб?

— І да кашы, і да чаю.

Гатуючы панцак, повар сыпаў соль і дадаваў нейкія спецыі. Паступова на кухні стала душнавата, і Платонаў на два гузікі расшпіліў гімнасцёрку. Гэта дазвалялася. Умацаваўся настрой. Калі каша была гатова, старшына Прахарэнка зняў пробу. Ухваліў, даў дазвол спажываць, ацэньваючы, зірнуў на Платонава, на яго расшпілены каўнер, але нічога не сказаў. Доўга ў кухонным смуродзе не затрымаўся, пайшоў у капцёрку.

— Тула павінен рыбу даць на вячэру, у яго ключы ад склада, — сказаў наўздагон яму Дзадзанія, але старшына не зрэагаваў, пэўна, не пачуў.

Снеданне прайшло ў дзелавой абстаноўцы.

— Дзяжурны, не будзь жмотам! — прасіў дабаўкі Ганіеў. — Дай яшчэ.

Гэта была прэрагатыва Дзадзаніі, ён плюхнуў у бляшаную міску чарпак панцаку. Пасля гэтага Ганіеў выпіў яшчэ і некалькі кружак чаю.

— Маладзец! — невядома каго пахваліў ён, хутчэй за ўсё, самога сябе.

— Смачная ежа — бальзам для душы, — сказаў Ганіеў, шырэй адпускаючы рэмень на жываце.

— Як патопаеш, так палопаеш, — заклапочана прамовіў Хамянок — вадзіцель «ГАЗ-63». Мелася ў роце і грузавая машына, на якой падвозіліся ў асноўным харчы з Навазыбкава.

— Усё нармалёва! — ацаніў старанні Платонава Коля Семашкевіч.

Вялікі клопат для дзяжурнага па кухні — мыць посуд: бляшаныя міскі ды лыжкі, каструлі і чарпакі.

— Можа, дапамагчы? — падышоў Аркаша. Платонаў падзякаваў і адмовіўся. Мыючы посуд, угрэўся, твар пакрыўся пісягамі поту.

— Ну, тады я пайшоў, — сказаў Аркаша. Яго прызначылі апаратарам на П-20. «Дваццаткай» камандаваў старшы лейтэнант Масол — адзін з афіцэраў роты.

Платонаў адбыў свой нарад. Памытыя талеркі для чысціні абліваў яшчэ і крутым варам.

— Ты чаму не ясі? — папытаў Дзадзанія.

— Няма калі.

— Паеш!

— Дык і ты не ясі.

— Я прывык сняданак з віна пачынаць. Вось каб зараз віна, як у Грузіі!

Грузія — любімая тэма Дзадзаніі. Пра Грузію ён гаварыў з любоўю і з моцным пачуццём настальгіі. Хваліўся, што Грузія — радзіма віна і што любімае яго віно — «сапераві». Яно гатовае ў пачатку зімы, і да віна трэба сыр, хлеб і тархун. А яшчэ смачнае віно — «хванчкара».

ПАЭЗІЯ

# Людміла Кебіч
# ТРЭБА ЖЫЦЬ

*Вершы*



***Кебіч (Вайтулевіч) Людміла Антонаўна*** нарадзілася 17 ліпеня 1951 года ў г. п. Красасельскі Ваўкавыскага раёна.

Старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Лаўрэат прэміі імя А. І. Дубко Гродзенскага аблвыканкама «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва» ў намінацыі «Пісьменнік года» (2002). Пераможца рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Лепшы твор года» ў намінацыі «Песенны жанр» за цыкл песень «Словы прызнання» (2010). Пераможца III абласнога літаратурнага конкурсу рукапісаў імя Цёткі (А. Пашкевіч) у 2020 годзе. Уладальнік дыплома і тытула «Чалавек года Гродзеншчыны» (2013). Узнагароджана медалём Францыска Скарыны (2014).

Аўтар 19 кніг вершаў і прозы для дзяцей і дарослых, двух зборнікаў песень. Друкавалася ў перакладзе на рускую, украінскую, польскую, літоўскую, азербайджанскую мовы. Жыве ў г. Гродна.

## ВЕЧАРЭЕ

Вечарэе над Нёманам сінім:
Невыразнасць абрысаў і ліній,
Што ляжаць на аціхлай вадзе, —
Ноч паціху на Нёман брыдзе.

І таму птушы грай замаўкае,
Кожны ў лесе дамок свой шукае,
Нават ветрык залёг пад кусток —
Незаняты, надзейны куток.

Вось бы ў час гэты там апынуцца,
У начную ваду акунуцца —
Змыць за дзень назапашаны бруд
І ашмоцце нядаўніх пакут.

Ранкам чуйна вада задрыжыць:
— Трэба жыць, трэба жыць, проста жыць!
І рассыпле спадзеваў сувой
Новы дзень над маёй галавой.

ПРОЗА

# Таццяна Цвірка
# ТРЫ АПАВЯДАННІ



**Цвірка Таццяна Канстанцінаўна** нарадзілася 25 жніўня 1967 года ў вёсцы Рассветная Клецкага раёна. Скончыла Нясвіжскае педагагічнае вучылішча (1987) і філфак БДУ (1994).

Працавала ў Клецкім дзіцячым доме № 1, загадчыкам дзіцячага сада «Дзюймовачка» ў Клецкім раёне, выкладала беларускую мову і літаратуру ва УА «Даматканавіцкая СШ», была дырэктарам прыватнага прадпрыемства «Рунька-торг».

Аўтар зборніка вершаў і песень «Ясачка долі маёй» (2013), празаічнага зборніка «Слодыч мяты — горыч палыну» (2017), паэтычнай кнігі «Зноў з табой я, месцейка святое» (2018), кнігі вершаў на дзвюх дзяржаўных мовах «І толькі май іх не забудзе» (да 75-годдзя Вялікай Перамогі) (2020).

## ПАЧАТАК

— Гэй, маладая, прыгожая, дай руку, паваражу ды ўсю праўду раскажу… — таўсматая, з высветленымі пасмамі цыганка ледзь не схапіла Алесю за руку. Жанчына адчула водар нятанных духоў, перамешаны з пахам тытуню, смела глянула ў вочы варажбіткі:

— Маё жыццё мяне не цікавіць, — рэзка адвяла руку, заспяшалася ўверх па лесвіцы, каб не спазніцца на маршрутку. Але выразна пачула словы прадказальніцы, што ляцелі наўздагон:

— А дарэмна! Будзе ў цябе ў жыцці яшчэ смак. Прыйдзе галоўны мужчына ў твой лёс!

Амаль год прайшоў з той выпадковай сустрэчы на вакзале з цыганкай (Алеся ехала ад дачкі з Германіі), і вось — як варам абліло: успомнілася да драбнічак, як тады ўголас прамовіла: «Галоўны мужчына майго лёсу трэці год блукае нада мной бялюткім воблакам, выклікаючы паталагічныя змены сардэчнага рытму»…

Як яно яшчэ б’ецца, гэтае стомленае сэрца жанчыны — з выгляду маладжавай, па гадах — пенсіянеркі, учарашняй настаўніцы хіміі. Колькі яно перажыло, вытрывала пасля раптоўнай смерці мужа (выяўленая анкалогія з’ела яго за некалькі месяцаў). Алеся дакарала сябе, што своечасова не заўважыла бяду,

не зберагла каханага… Якой яны былі прыгожай і выбітнай парай! Праз жыццё — рука ў руцэ, душа ў душу. Не вынесла ўдава страты — трапіла ў рэанімацыю з інсультам. Думала, забярэ Мішка за сабой, але Божанька вырашыў інакш. Выкарабкалася паціху. Адступіла хвароба. Лілечка дапамагла, дачушка іх, прыгажуня, разумніца, якая, скончыўшы медуніверсітэт, пацвердзіла дыплом у Германіі і працавала стаматолагам у нямецкай клініцы. Пакрывалася крыўдлівымі язвамі мацярынская душа за дачку: «Уся ў рабоце. Далёка за трыццаць, а ні каханага чалавека, ні сям'і…» Ведала маці, што дзеля заробку рвалася ў чужую краіну Ліля, адчувала, як сумуе дзяўчына па родным кутку, але не ўмешвалася. І дачка маўчала. Прывыкала.

Праз тры месяцы пасля выпіскі з раённай бальніцы Алеся ўжо выглядала з вокнаў нямецкай клінікі: Ліля па страхоўцы афарміла яе на рэабілітацыю. Здавалася, і вокны такія ж, як у Беларусі, і за вокнамі — дрэвы як дрэвы, і птушкі аднолькава трэлі выводзяць. Не... Гэта была чужына! Глядзела Алеся, як зачапіўся за галінку малады месяц, і ляцела ў думках у родны пасёлак, дзе гэты ж самы месячык-сярпок п'е цішыню са смарагдавага стаўка, а загадкавыя зоркі пахнуць сакавітай алычой і духмянай мятай; дзе суседскі белалобы шчанюк любіць злізваць крошкі з яе далоняў… Дзе ўнутры спее нешта трывожнае, але прачыстае і спадзеўнае. Дзе яе чакае Радзіма... І няма нічога больш жаданага.

Родныя сцены, здалося, суцешылі і адагрэлі жанчыну. Але зацвярдзелае сэрца не выпраменьвала радасці. У барацьбе з самой сабою Алеся страчвала сілы. З люстэрка на яе глядзела пасівелая змучаная асоба. Вырашыла: жыццё скончана, і не страшна, і не сорамна адысці ў даліну сноў. Вечарамі пісала мужу віртуальныя лісты. Раствaралася ў адзіноце, адчуваючы, як у пакоі гуляе беспрытульнік-скразняк...

«Мамачка, еду ў водпуск!» — ранішні нечаканы званок ад дачкі стаў сто першай спробай змяніць жыццё. «Божухна! Якая цудоўная навіна! Год, лічы, не бачыліся!» — ледзь не скакала ад шчасця Алеся. Адкуль і сілы прыйшлі! Усе закуточкі папрацірала, фіранкі новыя на вокны павесіла, наварыла-насмажыла прысмакаў розных. У суботу чакала, калі каля пад'езда спыніцца таксі. Не вытрывала, пасунулася з трэцяга паверха на лавачку, што лавандавай фарбай прыветна сустракала жыхароў дома, прысела і слухала, як адзываецца, трапеча сэрцайка ў прадчуванні сустрэчы з самым родным чалавекам.

Таксі тармазнула акурат перад пад'ездам.

— Лілечка! — кінулася да сонечнага аўтамабіля Алеся. Вадзіцель выйшаў першы, адчыніў заднія дзверцы машыны, ля якіх ужо тупала Алеся. — Дачушка! — І замерла, знямела. Шырока ўсміхаючыся, дачка працягвала ёй жывы скрутак, у якім ружавеў дзіцячы тварык з блакітнай пустышкай у роціку.

— Прывітанне, бабулечка! Гэта Майк! Заўтра нам будзе месячык.

«Ах, сэрца! Якое ж ты неўтаймоўнае! Падскочыла да самага горла, гатовае выскачыць і пакаціцца!»

— Майк! Майкуша! Міхаська па-нашаму! Мішуцік! — паўтарала і паўтарала светлае імя ўнука Алеся. — Як жа хораша, як правільна ты назвала яго, дачушка. Як дзядульку! А які ж прыгожанькі! На дзядулю і падобны! І тварык кругленькі, і носік кірпаценькі, і вушкі крышку адтапыраныя… Сонейка наша!

Хацелася прыгаршчамі сыпаць пытанні і папрокі дачцэ: «Чаму маўчала? Хто тата? Якія планы?» Але глядзела ў шчаслівыя вочы Лілі і толькі ўсміхалася. Жанчына церабіла ў руках маленечкія пальчыкі з ружовымі пазногцікамі і адчувала, што гэтае бездапаможнае немаўлятка ачышчае яе збалелую душу так, як чысцяць рэчку крыніцы, здымае зацяжную дэпрэсію і адкрывае другое дыханне! Падумала: «Як проста бывае вярнуць сэнс жыцця! Малюсенькія пальчыкі галоўнага мужчыны яе лёсу трымаюць вялікі бабулін палец, бяззубы роцік



ПАЭЗІЯ

# Галіна Бабарыка
# АСЕННІЯ АДЧУВАННІ

*Вершы*

***Бабарыка Галіна Сідараўна*** нарадзілася 19 чэрвеня 1960 года ў вёсцы Мачуль Столінскага раёна. У 1979 годзе скончыла Магілёўскае педагагічнае вучылішча, у 1987 — Магілёўскі педагагічны інстытут. Па накіраванні чатыры гады працавала настаўніцай на Клімаўшчыне, пасля пераезду — у роднай школе. За дасягнутыя поспехі ў навучанні і выхаванні ў 1991 годзе ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Аўтар зборнікаў паэзіі «Давер» (2004), «Дарога ў восень» (2015) і «Матывы Моўствы» (2021). Лаўрэат Міжнароднага літаратурнага конкурсу «Сям'я — Адзінства — Айчына» (2014), Літаратурнай прэміі імя У. Калесніка Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта (2017), пераможца Брэсцкага абласнога конкурсу «Духоўная веліч» (2018).

## КРЭДА ВОСЕНІ

Вецер кудзелю аблокаў прадзе,
Лісце скідае пад ногі,
Гоніць, як ветразь, па стылай вадзе,
Мосціць лістотай дарогу.

Дождж — як праз сіта, шэрасць і змрок,
Смутак ва ўсім наваколлі…
Гэта прырода дае нам урок —
Жыць, калі сіл няма болей.

Жыць — калі радасна, жыць — калі боль,
Жыць — як надзеі не будзе:
Час адыходу, зямную юдоль
Вызначыць Бог, а не людзі…

Восень сыходзіць у дальні абшар,
Плача яна прад сыходам.
Быццам лістоту, лісты каляндар
Скіне да новага года.

ПРОЗА

# Аляксандр Быкаў

# НЕ ПЯРОМ АДЗІНЫМ

*Аповед паэта і... марафонца*



***Быкаў Аляксандр Генадзевіч*** нарадзіўся 7 верасня 1954 года ў Барысаве. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ (1985). Працаваў на розных пасадах у рэгіянальным друку. У 1975 годзе, падчас службы ў арміі, узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку» за ўдзел у ліквідацыі наступстваў падтаплення на Брэстчыне.

Аўтар паэтычных зборнікаў «Кветка папараць» (2005), «Пад небам буслiным» (2007), «За межы круга» (2013), «І тым не менш» (2016), «Барысаўскі тракт» (2019), кнігі гумару «Пегас на сотках» (2018), а таксама кнігі прозы «Бабуліны макі» (2015). Пераможца Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Залаты Купідон» за лепшы літаратурны твор 2013 года ў галіне паэзіі (кніга «За межы круга»).

## 1

Жыццё чалавечае падобна да забегу спартсмена на пэўную дыстанцыю. У кожнага яна розная: у каго — доўгая, як нітка з верацяна, у каго — кароткая, як зімовы дзень. І там, і там патрабуюцца немалыя высілкі — як фізічныя, так і душэўныя. Ды, зрэшты, Бог дае менавіта столькі, колькі можам панесці. Іншая рэч, што не заўсёды дакладна размяркоўваем свае сілы, адхіляемся на пустое, непатрэбнае, трапляем у абцугі нявер’я і падманных мрояў. Мой аповед ні на што не прэтэндуе ў літаратурным сэнсе. Тэкст можа падацца манатонным, сюжэт, эмоцыі і разважанні не надта глыбокімі. Найперш меў на мэце паказаць частку зямнога шляху чалавека, які нечакана ўсвядоміў рэальнасць свайго беззмястоўнага, мітуслівага быцця. Недзе ў сутарэннях душы закарцела раптам рэзка павярнуць жыццё і пастарацца выскачыць за межы, здаецца, назаўсёды акрэсленага кола шматлікіх застолляў, пустых размоў пад чарку, прыдуманых сяброў. Могуць сказаць, што маладосць на тое і дадзена, каб не цурацца розных спакус, набіваць гузакі на лбе. Бо хапае імпэту і здароўя, а наперадзе — далёкі-далёкі жыццёвы шлях. Толькі нішто ў гэтым свеце не бывае бясконцым...

Мне тады ўжо пераваліла за сорак. Праца ў раённай газеце не вымагала значных фізічных затрат, ды і вольнага часу хапала. Але не магу сказаць дакладна, чаму абраў менавіта бег. У школе на ўроках фізкультуры не надта любіў гэты від спорту і вынікаў асаблівых не паказваў. Вось у дваровы фут-

бол ганяў з ахвотай. Колькі чаравікаў было сапсавана, пакуль бацькі не купілі нарэшце кітайскія кеды! І на колькі хапала тых кедаў?! А сапраўднае бегавое выпрабаванне прайшоў потым — падчас армейскай службы. Крос на шэсць кіламетраў пад летнім спякотным сонцам аказаўся сапраўднай пакутай для маладых салдат: на нагах цяжкія боты, на баку — сумка з процівагазам, а на грудзях — «калаш». Спрактыкаваны старшына роты бяжыць разам, але без амуніцыі, і толькі падганяе: «Варушыце поршнямі, салагі, залік па апошнім!» Дабег тады, у адрозненне ад некаторых, цалкам знясіленых, якіх падабраў на трасе армейскі грузавік. На фінішы, вядома ж, агарнула стомленасць, захацелася хутчэй прылегчы на сакавітую духмяную траву ля пыльнай дарогі і назіраць, як плывуць кудысь у ліпеньскім небе бязважкія белыя воблачкі. Адначасова было ў душы і непадробнае задавальненне ад таго, што вытрымаў, здолеў пераадолець сябе. Мо якраз гэты момант застаўся недзе ў падсвядомасці і праз два дзясяткі гадоў даў пэўны штуршок?

Пасля арміі вёў звычайны для таго часу лад жыцця, які, усё ж, пэўным чынам змяніўся, калі з трактара перайшоў працаваць у заводскую шматтыражку. Працягваў гуляць тады-сяды са знаёмымі хлопцамі ды братам у футбол, а яшчэ ў валейбол. І каб хтось сказаў тады, што праз колькі год буду бегаць марафоны, толькі б шчыра пасмяяўся...

Добра памятаю свой першы афіцыйны марафон 9 мая 1998 года. Стартавалі мы з гарадскога пасёлка Крывічы ў напрамку Мядзела. Прыехалі вядомыя ў Беларусі бегуны, нават аматары спартыўнай хады. На той час я не быў гатовы да такой працяглай дыстанцыі. Толькі папярэднім летам распачаў бегавыя трэніроўкі на стадыёне і большую за шэсць кіламетраў дыстанцыю не пераадольваў. Праўда, было выключэнне, калі падчас правядзення знакамітага «Нарачанскага кальца» адважыўся прабегчы 30 кіламетраў. І, як ні дзіўна, закончыў дыстанцыю, хоць і хістала ўжо на фінішы ад стомы і спякоты. Але «марафон» — іншая рэч. Ён, як кажуць прафесіяналы, пасля «трыццаткі» толькі і пачынаецца. Калі да горада заставалася прыкладна кіламетраў дзесяць, сілы канчаткова пакінулі мяне, здавалася, гэта дарога ніколі не скончыцца. Давялося часова перайсці на крок. А тут якраз насустрач сын пад'ехаў на веласіпедзе:

— Ну што, баця, хопіць мо? Давай падвязу!

— Не, — кажу, ледзь варушачы вуснамі, — дабяруся неяк сам. Чаго ж тады пачынаў!

Фініш быў на гарадскім стадыёне, дзе кожнага спартсмена не толькі сустракалі суддзі, але і віталі апладысментамі балельшчыкі. Потым ужо даведаўся са спартыўнай літаратуры, што свой першы марафон абавязкова трэба завяршыць. Інакш негатыўныя эмоцыі могуць замацавацца ў свядомасці і не стане жадання ўвогуле займацца бегам.

Менавіта пасля крывіцкага марафону мядзелец Андрэй Паспелаў, які зусім выпадкова ўбачыў мяне на дыстанцыі, прапанаваў бегаць разам. З задавальненнем пагадзіўся, бо трэніравацца ў «спарцы» — зусім іншае. І хоць хлопец быў на адзінаццаць гадоў маладзейшы, гэта не стала перашкодай. Траса наша праходзіла па ўзбочыне шашы Нарач — Мінск. Не лепшы, вядома, маршрут, але дзе яшчэ бегаць вялікія адлегласці, ды яшчэ круглы сезон?! Нарошчвалі аб'ёмы паступова, не зважалі на надвор'е. І ўжо вясной, каб праверыць свае сілы, прабеглі трэніровачны марафон. На ўсялякі выпадак усю дыстанцыю суправаджаў нас сусед на «Жыгулях». Толькі яго дапамога так і не спатрэбілася (хіба што вады падаць!), забег прайшоў нармальна. Менавіта з таго часу і сталі разам рэгулярна ўдзельнічаць у лёгкаатлетычных спаборніцтвах, у тым ліку і марафонскіх. Наперадзе быў доўгі шлях, які ўвабраў у сябе не адну тысячу

ПАЭЗІЯ

# Настасся Нарэйка

# КУПАЛЬСКІ КОН

*Вершы*



***Нарэйка Настасся Мікалаеўна*** нарадзілася 28 кастрычніка 1986 года ў горадзе Маладзечна. У 2004 годзе скончыла Маладзечанскую беларускую гімназію. У 2009 годзе скончыла Інстытут журналістыкі БДУ, па размеркаванні трапіла ў рэдакцыю раённай газеты «Навіны Камянеччыны», дзе і сёння працуе адказным сакратаром. З 2019 года працуе на палову стаўкі інструктарам па прапагандзе беларускай мовы і літаратуры пры Брэсцкім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіруе літаратурным гуртком для школьнікаў «Жарынка», створаным пры рэдакцыі названай вышэй газеты.

У 2013 годзе выдала кнігу вершаў «Магдэбургскае права маёй душы», за якую ў 2017 годзе атрымала літаратурную прэмію Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта імя Уладзіміра Калесніка.

## КУПАЛЬСКІ КОН

**1.**

За Купаллем надыдзе адхланне,
Час, калі разбураюцца казкі.
Загарыцца над намі світанне.
Толькі ты не мані, калі ласка.

Толькі ты, як руку адпускаеш,
Не кажы мне, каханы, нічога.
Бо калі не ад сэрца гукаеш,
Не пачуеш ты голасу Бога.

Я прашу: зберажы мой вяночак.
Ты дарма яго вылавіў з рэчкі...
Лёс назад не паверне. І ночак
Будзе многа яшчэ. Только свечкі

Не запаліш нанова ніколі.
Абяцаеш, што вернем каханне?

Мілы хлопчык ты мой — ад нядолі.
За Купаллем надыдзе адхланне.

**2.**
Вызвалі мяне ад болю, Божа!
Я малюся.
Верыш?
Ці не верыш?
Я ў Цябе паверыла. І можа,
Ты перада мной адчыніш дзверы?..

Я прасіць баюся. Я баюся!
І інакш — паверыш? — немагчыма.
Я не знала, што каханне мусіць
Болем быць мацнейшым, чым Радзіма,

Чым жыццё і мова, лёс і крылы,
Дадзеныя небам — на збавенне.
Я не знала, Божа, Божа мілы,
Чалавек — нягоднае стварэнне.

Вызвалі мяне ад болю, Божа!
Некаханне — прорва і пакута.
І ніколі лёс звязаць не зможа
Тое, што адзіна болем скута.

Божа, не ўдаецца мне малітва.
Гэта проста верш — інакш не ўмею.
Я жанчына. Я — зямля, не бітва.
Перад гэтай сілаю — нямею.

Вызвалі — ад горкага кахання.
Раскажы, што недзе ёсць дарога.
Доўгая — ад ранку да змяркання.
Вечная — ад гора і да Бога.

Толькі гора прывядзе да Бога.
Толькі боль гаротнага кахання.
Ты са мною, а ў руках — нічога.
О, дазволь раскошу развітання!

**3.**
У гэтым ціхім горадзе з табою
Мне мроіцца начамі мора шум.
І лёгка так — ні горычы, ні дум:
Мне мроіцца далёкі кліч прыбою.

У гэтым ціхім горадзе начамі
У сцены хвалі б’юць. Ці мне здаецца?





**Георгій Марчук**

# БОЖЫ ДАР

*Раман-хроніка майго жыцця.*
*Працяг. Пачатак у №5, 6 за 2024 г.*

***Марчук Георгій Васільевіч*** нарадзіўся 1 студзеня 1947 года ў Давыд-Гарадку. Пасля заканчэння школы № 2 у Давыд-Гарадку працаваў ва ўстановах культуры. З 1969 года — у Мінску: адміністратар кінастудыі «Беларусьфільм», асістэнт рэжысёра аб'яднання тэлефільмаў той жа кінастудыі. Скончыў аддзяленне тэатразнаўства Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1973), Вышэйшыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў у Маскве (1975). Загадваў літаратурнай часткай Тэатра-студыі кінаакцёра, працаваў дырэктарам выдавецтва «Мастацкая літаратура», галоўным рэдактарам кінастудыі «Беларусьфільм» і ў апараце Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аўтар кніг прозы «Крык на хутары» (1983), «Кветкі правінцыі» (1986), «Вочы і сон» (1990), «Сава Дым і яго палюбоўніцы» (1990) і іншых, шэрагу п'ес, кіна- і тэлефільмаў.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1996), Нацыянальнай літаратурнай прэміі (2018). Памёр 23 жніўня 2023 года.

## Рознае

Не варта было мне ўжо так убівацца. Пасля Даўгаўпілса ў мяне ўсталяваліся кантакты з Туравым, але чыста чалавечыя. Не творчыя. Ён усё сумняваўся, што ў такім маладым узросце я магу напісаць аб'ёмны раман. Была на студыі ганебная традыцыя арыентавацца на сцэнарыі маскоўскіх аўтараў. Толькі А. Дзялендзіку ды А. Петрашкевічу і ўдалося «праціснуць» свае сцэнарыі. Я меў недастаткова вопыту ў гэтых закулісных гульнях.

Амаль не меў славы фільм па аповесці В. Быкава «Воўчая зграя». Да фільма «Альпійская балада» яму было ой як далёка. На пачатку 1978 года на «Масфільме» заснавалі для падтрымкі маладых рэжысёраў і сцэнарыстаў аб'яднанне «Дэбют». Гэта быў шанс, і мяне разам з маім сябрам В. Рыбаравым камандзіравалі ў Маскву. Нам далі права на пастаноўку. Мы сталі шукаць сцэнарыі на кароткаметражныя дэбюты. Мяне цягнула ў камедыю, і я шукаў адпаведны сюжэт, чытаў творы ўсіх беларускіх пісьменнікаў, шукаў гумар, а часу было мала. Нарэшце засяродзіў увагу на гумарыстычных мініяцюрах народнага пісьменніка Я. Брыля. Разам з дэбютанткай Юравай, якая жыла

ў Маскве, напісалі сцэнарый. Мастацкім кіраўніком прызначалі мне досыць вядомага сярод рэжысёраў Васіля Ардынскага. Доўга «чапляліся» да якасці сцэнарыя, але нарэшце на мастацкім савеце яго зацвердзілі. Натуральна, для здымкаў камедыі трэба было запрашаць камедыйных акцёраў. С. Крамараў не змог даць згоду, а ленінградскі комік А. Смірноў згадзіўся. Гэта быў для мяне падарунак. У яго ў той час пачыналіся сур'ёзныя праблемы з сэрцам. Бачна было, што яму цяжка дыхаць, брала задуха.

У гасцініцы Бабруйска, у якой месцілася наша кінагрупа, было штодзённае свята і сярод камандзіровачных у рэстаране, і на вуліцы, і ў калгасе імя Арлоўскага, дзе былі натурныя здымкі — паўсюдна быў ажыятаж. Як жа людзі любілі Аляксея Макаравіча, кожны хацеў з ім павітацца, пацiснуць руку альбо пачаставаць. Нехта прыгадваў фільм А. Гайдая, а хтосьці фільм Л. Быкава «В бой идут одни старики». Аляксей Макаравіч, прачытаўшы мой сцэнарый, спахмурнеў: «Жора, няма камедыі. Анекдота няма. Камічныя героі слабенькія. Здымай больш маю рожу, каб трохі разбавіць». Я ў адказ: «Выкруцімся. Я падрыхтаваў гэгі». «Дай-то Бог», — адказаў ён. У фільме дэбютавалі малады акцёр Я. Крыжаноўскі, які з часам заснаваў сатырычны тэатр «Хрыстафор», і малады кампазітар В. Іванаў. Месяц здымкаў праляцеў хутка. Аляксей Макаравіч песціў маю чатырохгадовую дачушку Наташу, частаваў яе сырам, які сам вельмі любіў. Тады я цвёрда ўцяміў тое, што калі ты і жывеш у гасцінічным люксе, гэта яшчэ не дадае табе таленту. У жніўні я павёз гатовы фільм у Маскву. Хтосьці з членаў мастацкага савета пахваліў асобныя мае гэгі, хтосьці застаўся абыякавым. Далейшы мой лёс вырашылі перакласці на мінскае кіраўніцтва. За ўсю гісторыю беларускага кіно атрымалася адна камедыя «Нашы суседзі», студыя лічылася ў Саюзе «Партызанфільмам».

Мой парыў ажывіць гэты складаны жанр застаўся парывам. Сцэнарыяў камедый на працягу дзесяці гадоў не было. Дырэктар кінастудыі, неблагі чалавек, незласлівы, спачуваў мне, але ён не быў галоўным у размеркаванні матэрыяльных сродкаў. Рэжысёрскую перспектыву мне закрылі вышэй — у дзяржаўным камітэце кінематаграфіі. Мне далі зразумець, што студыі не патрэбны камедыі, рызыкоўная гэта справа. Не заступіўся і Тураў. Я заўважыў, што яму не спадабалася мая незалежнасць. Я не прасіў яго, як худрука, паглядзець мой дэбют, у нечым дапамагчы. Дзверы ў рэжысуру, як я зразумеў, зачыніліся. Мой аптымізм крута змяніўся на песімізм. Я адчуў сябе зняважаным, нікому не патрэбным. Баяўся ісці на студыю, было сорамна. Не радавала ні любімая жонка, ні ласкавая дачушка. Я спалохаўся за сваю псіхіку. Упершыню адчуў заняпад духу. Дурныя думкі запаланілі галаву. Жонка супакойвала: «Што гэта, канец свету ці што? Што, «Беларусьфільм» Галівуд ці што? Рэжысёры па тры гады стаяць у прастоі, чакаючы пастаноўкі. Чаго так убівацца да смерці ад гэтай рэжысуры. Сядай да стала ды пішы», — сказала яна. Я перачытаў першы варыянт рамана, за два месяцы давёў яго да канчатковага стану і панёс у рэдакцыю часопіса «Полымя». За год да гэтага ў мяне ў Саюзе пісьменнікаў адбылася сустрэча з загадчыкам аддзела прозы часопіса І. Пташнікавым, вядомым празаікам рэспублікі. Я самаўпэўнена заявіў, што чытаю рэгулярна «Полымя» і што ў ім няма арыгінальнай прозы. «Напішыце, Георгій, самі, прынясіце, а мы пачытаем», — з усмешкай адказаў Пташнікаў. У Саюзе была такая пагалоска, што калі ты пройдзеш праз рэдактуру Пташнікава і твой твор надрукуюць, можаш лічыць сябе пісьменнікам. І я чакаў яго адказ. Чакаць давялося год. Для нас той год быў цяжкі, часта хварэла дачушка.

**Мікола Мікуліч**

# «О, РАЗВЯЖЫ, ПАЭЗІЯ, ЯЗЫК МОЙ»

*Да 40-годдзя выдання зборніка Максіма Танка «За маім сталом»*

Разважаючы падчас адной нашай сустрэчы, здаецца, у красавіку 1995 г. пра сваю творчасць, Максім Танк адной з самых удалых уласных кніг назваў апошні зборнік вершаў заходнебеларускага перыяду «Пад мачтай», які выйшаў у 1938 г. «Я лічу, гэта адзін з маіх лепшых, этапных зборнікаў, — сцвярджаў паэт. — Ну, этапным з'яўляецца «На этапах», паколькі ён першы. Другі — так, сярэдні. «Нарач» мне перапісаць трэба было б. А найбольш спелым быў якраз гэты, «Пад мачтай». Станіслаў Станкевіч і іншыя сустрэлі яго як упадак таленту аўтара і г. д. Я помню, Пушкіна недзе чытаў. Нягледзячы на тое, што Пушкін напісаў свае лепшыя творы, для многіх ён лічыўся песняром «Руслана і Людмілы». Ну, і што ты тут будзеш рабіць? Аўтар вырас, а чытач застаўся тым самым — вось як здараецца».

Розныя нашы даследчыкі, крытыкі і літаратуразнаўцы, розныя пісьменнікі, паэты, многія з якіх, дарэчы, раслі, выхоўваліся на традыцыях М. Танка, вылучаюць розныя кнігі народнага паэта Беларусі. У. Калеснік, напрыклад, высока цаніў зборнік «Пад мачтай», М. Арочка асабліва вылучаў ідэйна-мастацкія характарыстыкі «Дарогі, закалыханай жытам» (1976). Лепшай кнігай не толькі М. Танка, а і ўсёй беларускай паэзіі, побач з «Вянком» М. Багдановіча, Д. Бічэль называе другі зборнік вершаў паэта «Журавінавы цвет» (1937), адным з самых моцных танкаўскіх зборнікаў У. Гніламедаў пераканана лічыць яго першы пасляваенны зборнік «Каб ведалі» (1948), В. Зуёнак — зборнік перыяду грамадска-сацыяльнай адлігі «След бліскавіцы» (1957), а А. Верабей — усё тую ж кнігу «Пад мачтай». Найлепшым зборнікам М. Танка, на думку Л. Дранько-Майсюка, з'яўляецца кніга паэзіі «Дарога, закалыханая жытам», сваім любімым танкаўскім зборнікам В. Шніп называе кнігу «Прайсці праз вернасць» (1979). І гэта не дзіўна, — сапраўды, як адзначаў А. Разанаў, на кожным этапе ідэйна-мастацкіх пошукаў Максім Танк «сказаў сваё слова ў літаратуры, насыпаў свой "курган"». Літаральна ў кожным зборніку паэта можна выявіць выдатныя творы, сапраўдныя шэдэўры літаратурнага мастацтва, паэтычныя залацінкі, якія маглі б упрыгожыць самую адмысловую нацыянальную анталогію свету. У яго першым зборніку «На этапах» (1936) — гэта верш «Спатканне», у другім зборніку «Журавінавы цвет» — «Песня кулікоў», у чацвёртай кнізе «Пад мачтай» — верш «Паслухайце, вясна ідзе…»

Самым непераканаўчым на ідэйна-мастацкія здабыткі і дасягненні ў развіцці творчай індывідуальнасці Максіма Танка наша крытыка абгрунтавана называе пасляваеннае дзесяцігоддзе, калі талент паэта, як, зрэшты, і ўся беларуская і савецкая літаратура і мастацтва, адчуваў на сабе негатыўнае ўздзеянне сумнавядомай тэорыі бесканфліктнасці і ілюстрацыйнасці. Аднак і зборнікі гэтай, «неўраджайнай», гістарычнай пары ўтрымліваюць творы непрамінальнай ідэйна-мастацкай красы і вялікай эмацыянальнай сілы ўздзеяння на чытача.

ГУТАРКІ

# Уладзімір Цанунін

# «КАМУ ПАТРЭБНА ПАМЯЦЬ АБ ВАЙНЕ...»

На рахунку ***Уладзіміра Цануніна*** пятнаццаць паэтычных зборнікаў, якія атрымалі прызнанне як чытачоў, так і крытыкі. Але найбольш ён вядомы як аўтар і выканаўца бардаўскай песні. Менавіта ў гэтай якасці Уладзімір Яфімавіч стаў лаўрэатам шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў.

**— Уладзімір Яфімавіч, вы ў літаратуры працуеце амаль шэсць дзесяцігоддзяў. Ці памятаеце, калі і пры якіх абставінах быў напісаны (надрукаваны) першы верш?**

— Вершы я пачаў складаць яшчэ ў маленстве. Першае маё выступленне на сцэне адбылося, здаецца, у трэцім класе, калі да нас у школу прыязджаў Іван Шамякін. Ён тады быў дэпутатам Вярхоўнага Савета рэспублікі. Выслухаўшы мяне, Іван Пятровіч усміхнуўся і прамовіў: «Быць табе паэтам». Але членам Саюза пісьменнікаў Беларусі я стаў толькі праз пяцьдзясят гадоў.

У пятым класе мае вершы ўпершыню былі надрукаваны ў Крычаўскай раённай газеце «Ленінскі кліч». А вясной 1968 года школьнікаў з усёй Магілёўскай вобласці, якія нешта спрабавалі пісаць, сабралі ў абласным Палацы піянераў. На сустрэчу з намі прыйшлі Аляксей Пысін, Станіслаў Пятровіч Шушкевіч, Анатоль Астрэйка і Мікола Чарняўскі. Пасля таго, як мы прачыталі ім свае вершы, да мяне падышоў Станіслаў Пятровіч, пахваліў мяне і падарыў свой зборнік, які я захоўваю да гэтага часу. А Мікола Чарняўскі, тады супрацоўнік «Бярозкі», прапанаваў у гэтым часопісе надрукаваць маю «Песню пра Крычаў». І са жніўня 1968 года я стаў пастаянна друкавацца ў «Бярозцы». Так працягвалася да самага заканчэння школы. Таму заўсёды кажу, што сваім першым настаўнікам у паэзіі лічу Міколу Чарняўскага.

**— З таго часу вы сталі друкавацца шмат і ў розных выданнях. Але чаму так позна — у 57 гадоў — выдалі свой першы паэтычны зборнік?**

— Вершы пісаў усё жыццё, але адносіўся да іх даволі крытычна. Яшчэ студэнтам паспрабаваў надрукавацца ў Магілёўскай абласной газеце, у якой тады працаваў вядомы беларускі паэт Аляксей Пысін. Ён прачытаў мае радкі і сказаў: «Калі ў вершы з трох слупкоў ёсць хоць адна дзеяслоўная рыфма, то гэты верш не толькі друкаваць, але і чытаць не трэба». Гэта я запомніў на ўсё жыццё.

Пасля заканчэння Магілёўскага педагагічнага інстытута да самай пенсіі я працаваў настаўнікам гісторыі ў розных школах Беларусі. Вершы друкаваў у раённых і абласных газетах Брэсцкай, Магілёўскай і Мінскай абласцей. Але такое здаралася вельмі рэдка, бо не лічыў гэты занятак галоўным.

У пачатку 80-х паспрабаваў выдаць свой паэтычны зборнік, які паказаў вядомаму нашаму беларускаму крытыку Вячаславу Рагойшу. Ён прачытаў яго і

# Вячаслаў Адамчык

# З ДЗЁННІКА. СНЕЖАНЬ 1994 Г.

**Чацвер, 8 снежня.**

8.35. Чорны мокры асфальт у глыбокіх зрэнках лужынаў, паабапал чорнай ленты яго, як гускі, белыя гурбы нерасталага снегу.

У дымна-ружовых хмарах азярынкі блакітнага неба. Выясніваецца пагодны, нібы вясновы дзень. І сонца ўжо адбіваецца залацістай ломкай слюдою ў верхніх вокнах даўгаватых, як магнітафонныя каробкі, белых дамоў.

І душа просіць далечыні і парываецца на прастор палявое дарогі, што бяжыць уздоўж адзінокага хутара, чорнага, абсаджанага белымі бярэзінамі, да зялёнай руні, шчодра акропленай тлустымі скалкамі расы…

Чаго прагне чалавечая душа? Усяго толькі адзіноты і спакою?..

А ўчора на канале тэлебачаньня паказвалі тупавата-мардатага хлопца, які запісаўся добраахвотнікам, каб ісці ваяваць: «Хочу испытать себя».

Другі, нейкі М., што зарэззаў дзяўчыну, прызнаваўся на следстве: «Я зрабіў гэта для разрадкі».

Іаган Готліб Фіхтэ ў сваіх лекцыях аб рэлігіі, маралі і законах дзяржавы, між іншым, кароткаю фразаю агаварыўся: «Праўда, вечна будуць існаваць людзі, якія сваімі дурнымі норавамі змушаюць іншых справядліва пагарджаць імі». Ці, можа, лепш перакласці так: вымушаюць іншых мець справядлівую пагарду да іх.

Але дурныя норавы выхоўваюцца дзяржаваю. І той жа ж Фіхтэ кажа: «Няроўнасць ёсць сапраўдная крыніца дурных нораваў».

Не ведаю, як адносіцца да гэтых двух забойцаў, аднаго з якіх дзяржава пакарала, другога з іх, які таксама заб'е, згвалтуе і падпаліць дом, яна хоча ўзвялічыць і зрабіць сваім героем.

І той жа Фіхтэ кажа: «Мэта ізаляванай асобы — уласная насалода»… У дзяржаве кожны карыстаецца сваімі сіламі непасрэдна зусім не дзеля ўласнае насалоды, а ў мэтах роду (чалавецтва).

Нарэшце можна зразумець, каго з гэтых двух агідных гвалтаўнікоў і людарэззаў дзяржава палічыць сваім героем і заступнікам, каго рыссю з воўчаю пашчаю і сексуальным маньякам.

Зрэшты, «необыкновенным лицам ради высших целей можно преступить и убить» («Преступление и наказание»).

Чытаючы пра М., я, здаецца, трапляю на вузкую сцежку, што нарэшце выведзе мяне з цёмнага лесу няпэўнасці і разгубленасці на шырокі гасцінец новай аповесці…

Насалода для сябе і для роду чалавечага.

Саджуся за план, а найперш — за накід чарнавога варыянта.

На тумбачку кладу 7-мы том Дастаеўскага, зазірну ў каментары да яго рамана «Злачынства і пакаранне».

**Пятніца, 9 снежня.**

Фільм пра пахаванне «великого вождя» бясконцы і нудны, і наўрад ці патрэбны сёння непрыемныя брыдкаватыя знешнія тыпы — Берыя ў акулярах,

у капелюшы, нацягнутым на вушы, яго грузінскі акцэнт, непісьменная мова; мардаты Малянкоў, што не ўмяшчаецца ў сівую каракулевую вушанку; хмуры Хрушчоў у чорным капелюшы; свежы Молатаў у чорнай вушанцы. Усе на маўзалеі з надпісам: «Ленін. Сталін».

**Субота, 10 снежня.**

8.30. Ноччу бяссонніца. Не спаў з дзвюх да пяці гадзін. Пад сняжок, што ціха церушыў за акном, і пад цяжкі гул самалёта, што іскрыў рубінавым агеньчыкам, чытаў каментар да «Забойства і пакарання». Смурод канаў, пах дыму ад пажару, грукат экіпажаў ламавых, бруд кабакоў і распівачных, надтрэснуты голас дзіцячай песні і гукі шарманкі — гэта той Пецярбург, які бачыў наш нігіліст Каліноўскі і які апісваў былы катаржнік Дастаеўскі. Дарэчы, курыць на вуліцах горада было дазволена толькі з 4 ліпеня 1865 года.

Словам, Пецярбург фатаў, шыкароў (хлюстоў), захутаных у бабры, суфлёраў — жанчын лёгкіх паводзінаў, манкірантаў і «отталкивающих, омерзительных Свидригайловых».

19.10. У акне суседняга дома, на 5-м паверсе, — аранжавы абажур з фрэнзелямі ці кісцямі (махрамі) вяртае мяне ў 1942 год, калі наша сям'я пасля спалення вёскі апынулася ў мястэчку Наваельня, дзе ў суседнім доме Сымона Кардаша свяціўся гэтакі самы аранжавы абажур... Паўвека, а помніш палутарку ў канаве, дом Кардаша, майго равесніка Барыса, поўны пусты хлеў смярдзючых касцей і норы, вырытыя ангорскімі трусамі, а ў хаце — аранжавы абажур. Пад ім накрытыя абрусам пірагі, вяндліна і шынкі. А я быў галодны... Дзіка, страшна галодны. Барыс адкінуў абрус, і... Я замёр. Я спадзяваўся... А ён: «Тата з мамаю пайшлі ў госці».

На неглыбокі сняжок, на лужыны закрапаў дождж. На лужынах жывыя водбліскі.

**Нядзеля, 11 снежня.**

11.05. Перачытваю пісьмы Дастаеўскага да яго «милой, бесценной и единственной» Ані, з якой ён толькі што жаніўся, прыпадачны, з «ужасной разницей в летах» (20+44), як пісаў перад гэтым Суславай, мужчына, хілы здароўем, прыпадачны і нервовы.

І трэба ж папраўдзе зразумець маладую дзяўчыну, што выйшла за нездароўчага чалавека, які ў кожным пісьме паведамляе пра ігру ў рулетку, ад якое адарвацца не мог і прайграўся датла, да астатняй капейкі, пра сваю бездапаможнасць, што няма грошай на дарогу і няма чым расплаціцца за гатэль.

Але за гэтым «мятежом страстей» — страшнай магнэзай да «проклятой рулетки», за «возбужденными нервами», за гэтым нараканнем на халоднае надвор'е, пасля чаго разбалелася вуха і зубы, за непавагай да «подлых немцев», у дадатак — да «зверских снаружи жидов, што с ужасным хладнокровием и расчётом, нечеловеческим, <...> загребают деньги и уносят каждый день 6...1000 гульденов», — за «угрюмостью и капризами и надменностью своего мужа» яна разгадала, убачыла і ацаніла яго геніяльны і нікім не пераўзыдзены талент, і як ніхто і як ніколі гэтае кволае дзяўчо падтрымала яго ў хвіліну роспачы і адчаю, стаўшы на ўсё жыццё яго анёлам-стражам.

13.20. Пад сустрэчны град, што так востра і пякуча сек у твар, з Нінаю прайшліся да возера, дзе поўна чорных лысак, шара-белых чаек, крыжанак, нават карычняватых маладых лябедак (шэсць з дзвюма старымі белымі).

Над жаўтлява-белымі, колеру вапны, пяціпавярховымі дамамі кружыць чародка чорных, прынесеных цёплым цыклонам шпакоў.

О, колькі думак не запісана. Пра нашы, варакомскія валуны, напрыклад.

Прайшло, мінула ўсё, і нават валуны звязлі з сваіх лезбішчаў і разбілі, вечныя беларускія валуны, памятка нашай тапаграфіі.




## Анатоль Трафімчык

# МАТЭРЫЯЛЬНЫ СВЕТ У МАСТАЦКІХ ТВОРАХ УСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ ЛІТАРАТУР

*Шаладонава, Ж. С. Прастора і чалавек: усходнеславянскія літаратурныя праекцыі / Ж. С. Шаладонава. — Мінск : Беларус. навука, 2023. — 262 с.*

Напрыканцы 2023 г. убачыла свет манаграфія беларускай даследчыцы літаратуры, супрацоўніцы аддзела (у дадзеным выпадку паказальна) узаемасувязей літаратур Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі Жанны Шаладонавай на тэму не зусім звычайную для айчыннага гуманітарнага дыскурсу — успрыманне прасторы і чалавека ў ёй паводле мастацкай літаратуры на прыкладзе класікі прыгожага пісьменства ўсіх трох усходнеславянскіх народаў — між тым тэму патрэбную, якой відавочна дагэтуль бракавала, калі браць у разлік суседнія літаратуразнаўчыя дыскурсы, не кажучы пра гуманітарыстыку больш далёкіх краін, навукоўцы якіх з'яўляюцца заканадаўцамі даследчых мод.

Ужо з назвы бачна, што матэрыялам даследавання стала слоўнае мастацтва. Але аспектам вывучэння — праблема не столькі літаратуразнаўчая, колькі філасофская. З іншага боку, любая навука — гэта перадусім філасофія, з якой і выйшлі ўсе навуковыя дысцыпліны. Пытанне толькі ў тым, у якой ступені тая ці іншая навука наогул або тое ці іншае даследаванне характарызуюцца асабістай спецыфікай, індывідуальным інструментарыем у прыватнасці. Аднак тое не значыць, што інтэрдысцыплінарнасць і карэлізаванасць навук адмяняе права на іх існаванне, робіць недапушчальным правядзенне падобных даследаванняў. Наадварот, у сучасным свеце такія падыходы вітаюцца, знаходзяцца ў трэндзе не толькі гуманітарыстыкі, але і пры вывучэнні матэрыялістычнага боку нашага быцця.

Ж. Шаладонава паставіла на мэце выявіць якраз разуменне фундаментальнай уласцівасці свету — прасторы, без якой таго быцця не было б у прынцыпе. Тым болей, што «ў айчынным літаратуразнаўстве няма даследаванняў сімвалічнай знакавасці вобразаў прыроды ў беларускай літаратуры не толькі як "візітнай карткі" тэрыторыі і працэсаў яе творчага асваення, але як арганізаванай і структураванай цэласнасці прасторавых аб'ектаў адзінай усходнеславянскай знакава-семіятычнай сістэмы» (С. 11-12).

Анастасія Гатоўчыц

# ПРАДКАЗАННЕ БУДУЧЫНІ Ў МАСТАЦКІМ СВЕЦЕ АЛЕНЫ БЕЛАНОЖКІ




*Беланожка, А. Дзіця зямлі : фантастычныя апавяданні / Алена Беланожка. — Мінск : Звязда, 2023. — 208 с.*

Чытаючы апавяданні Алены Беланожкі, якія ўвайшлі ў зборнік «Дзіця зямлі», выдадзены ў 2023 годзе, узнікае жаданне даведацца, чаму аўтар абрала менавіта будучыню для сваіх творчых эксперыментаў і адкуль узялася такая колькасць разнастайных сюжэтаў пра навуковы прагрэс. Алена Беланожка — аўтар сцэнарыяў культурна-відовішчных мерапрыемстваў і тэатралізаваных канцэртаў; паэт, на вершы якога вядомыя беларускія артысты спяваюць песні; празаік, які ў сваіх творах звяртаецца да магчымых варыянтаў развіцця цывілізацыі. Пісьменніца прызнаецца ў інтэрв'ю (газета «Звязда»), што калі не аддала б перавагу працы ў сферы культуры, то абавязкова стала б генетыкам. Для сваіх празаічных твораў Алена Беланожка бярэ натхненне з навуковых тэлеперадач, якія міжволі прымушаюць задумацца аб тым, якім будзе грамадства, калі навука дасягне найвялікшага росквіту.

У зборнік твораў «Дзеці зямлі» ўвайшло пятнаццаць апавяданняў, якія Алена Беланожка друкавала апошнія дзесяць гадоў у часопісах «Маладосць», «Алеся», «Бярозка» і ў газеце «Звязда». Усе гэтыя творы прасякнуты адзінай думкай: якім будзе чалавецтва ў будучым, на якія ахвяры можа пайсці чалавек дзеля развіцця навукі? Аўтар у сваіх творах малюе пятнаццаць розных, непаўторных варыянтаў магчымай будучыні нашага свету. Які менавіта сцэнарый спраўдзіцца, залежыць толькі ад чалавека, ад таго, на якія ахвяры ён зможа пайсці дзеля навукі і, самае галоўнае, — гэта свядомае рашэнне: ці варты тэхнічны прагрэс такіх ахвяр?

Кнігу апавяданняў Алены Беланожкі адкрывае твор «Глобус Еўропы», у якім узнімаюцца пытанні  такіх маральных якасцей грамадства, як баязлівасць і абыякавасць (менавіта праз іх дарослыя людзі праходзілі міма хлопчыка, якога збівала кампанія падлеткаў: «Міма праходзілі людзі, але ўсе рабілі выгляд, што не адбываецца нічога асаблівага: ніхто не хацеў звязвацца з Выдзерам і яго кампаніяй), заклапочанасць сенсацыямі і нежаданне напружвацца дзеля іншага («"Яна ж тоне!" — падумаў хлопчык. Ён у адзіны момант збег з моста да вады, паставіў вядро, скінуў чаравікі і не задумваючыся плюхнуўся ў ваду. Хлопчык плаваў як дэльфін, таму праз некалькі імгненняў ужо быў каля дзяўчынкі. Ён падхапіў яе і пацягнуў да берага, дзе сабраліся людзі: яны заломвалі рукі, здымалі падзею на мабільныя тэлефоны, але ў ваду не ішлі»), страх за ўласнае жыццё, якое

# КНІГАРНЯ




## Міхась Сліва

# БЕЛАРУСКІЯ ЗОРКІ Ў БЛІЗКІМ ЗАМЕЖЖЫ

*Карлюкевіч, А. Пуцявінамі зорак : Ураджэнцы Беларусі ў блізкім памежжы / Алесь Карлюкевіч. — Мінск : Выдавецкі дом «Звязда», 2022. — 320 с.*

Гэтая кніга мае выдатнае мастацкае афармленне. А яшчэ яна надзвычай цікавая і змястоўная. Размова ідзе пра выданне Алеся Карлюкевіча «Пуцявінамі зорак: Ураджэнцы Беларусі ў блізкім памежжы» (Мінск: Выдавецкі дом «Звязда», 2022. — 320 с.). На рахунку Алеся Карлюкевіча мноства кніг і публікацый па літаратурным краязнаўстве. Дадзенае выданне яшчэ раз пацвярджае, што Алесь Мікалаевіч выбітны спецыяліст у азначанай галіне. Мяркуйце самі. У раздзеле «Жыві і цэльнасці шукай...» сем дзясяткаў(!) нарысаў — пра людзей, якія нарадзіліся ў Беларусі, але жылі і працавалі па-за яе межамі ў розныя часы: адны — у Расійскай імперыі, іншыя — у СССР. Уражвае дасведчанасць аўтара кнігі аб жыццёвых шляхах і дасягненнях нашых землякоў.

Выданне нездарма атрымала назву «Пуцявінамі зорак», бо яе героі — сапраўдныя зоркі, хаця, зразумела, і розней велічыні. Няма, відаць, ні адной сферы жыццядзейнасці, у якой бы ўраджэнцы Беларусі не праявілі сябе. Военачальнікі, навукоўцы, інжынеры, вынаходнікі, медыцынскія работнікі, педагогі, пісьменнікі, мастакі, архітэктары, артысты... Яны дасягнулі, кожны ў сваёй справе, надзвычайных вышынь. Амаль усе героі кнігі былі адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі. Многія былі ўдастоены прэстыжных дзяржаўных прэмій і высокіх званняў Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы. Лёсы іх склаліся па-рознаму, але ўсіх іх яднае любоў да роднай старонкі, да сваёй малой радзімы.

Дасягненні нашых землякоў выклікаюць захапленне. Вось, да прыкладу, аўтар кнігі адзначае плён Анатоля Рыгоравіча Кагана, які нарадзіўся ў Гомелі ў 1922 годзе. Ён зрабіў у геаграфічнай навуцы Расіі столькі, колькі не кожная геаграфічная кафедра можа зрабіць за дзесяцігод-